

## ГРАШОВЫЯ ПАЗЫКІ ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

4

## КРОКІ ДА РАДЫЕБЯСПЕКІ




МС

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 КРАСАВІКА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 80 (29194)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вадзім ДЗЯМКО, начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды:**

*«Штогод пасля святаў з могілак на палігоны цвёрдых камунальных адходаў вывозяць каля мільёна пластыкавых кветак. Тэрмін іх раскладання — ад 100 да 500 гадоў. Другасной апрацоўцы яны не падлягаюць. Альтэрнатывай ім павінны стаць жывыя кветкі ў вазонах, высаджаныя ў грунт мнагалетнікі, карлікавыя хмызнякі, газонная трава, свечкі, стужкі з тканіны».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ТРЭБА АПЕРАТЫЎНА ПРЫМАЦЬ РАШЭННІ ПА ТЫХ ПЫТАННЯХ, ЯКІЯ СЁННЯ ВОСТРА ПАЎСТАЮЦЬ ПЕРАД НАМІ»



Фота БелТА.

### На нарадзе ў Палацы Незалежнасці гаварылі пра самае важнае на сёння для дзяржавы і для людзей

**Пра тое, што ў чацвер у кіраўніка дзяржавы адбудзецца сур'ёзная размова, падказвалі і аб'ектыўная рэчаіснасць, і здагадкі журналістаў пула. Прафесійнае чуццё не падвяло: на чарговую нараду запрасілі кіраўніцтва ўрада, губернатараў, вайскоўцаў, памочнікаў Прэзідэнта — усяго больш за 40 чалавек. Тэма сустрэчы па размаху не саступае колькасці прысутных — першачарговыя меры па забеспячэнні работы эканомікі і сацыяльнай сферы Рэспублікі Беларусь ва ўмовах сусветнай эпідэміялагічнай сітуацыі. Калі прасцей, гаварылі пра захворванні, прамысловасць, адукацыю, дабрабыт людзей і межы, якія нечакана з'явіліся не толькі на карце, але і ў разуменні партнёраў. Але, каб пры сённяшняй сітуацыі знайсці баланс і прыйсці да паразумення, у гэтых і іншых сферах ад усіх патрабуецца адказнасць, дысцыпліна, самаадданасць і стараннасць. Гэта заклік на адрас і ўлады, і кожнага беларуса. «Нам трэба аператыўна прымаць рашэнні па тых пытаннях, якія сёння востра паўстаюць перад намі», — заклікаў Прэзідэнт удзельнікаў нарады.**

СТАР. 2

# Бацькава навука



**Жыхар гарадскога пасёлка Ушачы Генадзь КАРЭЙША настолькі моцна палюбіў і асвоіў кавальскае рамяство, што абсталяваў уласную кузню і робіць неабходныя сабе і людзям рэчы. Сын Ігар, які жыве ў Віцебску, часта наведвае малую радзіму, дапамагае бацьку-кавалю, становіцца малатабойцам і тым самым спасцігае сакрэты кавальскай справы.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

- **Больш чым Br500 тысяч пералічана ў прафсаюзны фонд страхавання медыкаў. Ён фарміруецца за кошт салідарных адлічэнняў усіх галіновых прафсаюзаў і добраахвотных ахвяраванняў грамадзян.**
- Наведаць могілкі ў зоне адчуження без пропускаў можна будзе 25—28 красавіка
- **Навучальныя заняткі ў школах Беларусі перанесены з 27 на 25 красавіка.**
- Прафсаюзы на суботніку прывядуць у парадак месцы баявой славы.
- **Беларускі гатунак бульбы з фіялетавай мякаццю адправяць на дзяржвыпрабаванні да канца 2020 года.**
- Мінсельгасхарч: запасаў агароднiны ў сховішчах у 3 разы больш, чым летась.

Спецыяльны рэпартаж

# МАСКА, ПАЛЬЧАТКІ І ДЫСТАНЦЫЯ

### Калі правіла гігіены сталі клопатам аб блізкіх

**Рэстаран хуткага харчавання забіты людзьмі, наколькі гэта мажліва. Маладая пара вачыма шукае свабодны столік. Знаходзіць і ў імгненне займае месца. Сцягваюць маскі на падбародак, усміхаюцца адно аднаму. Дзяўчына скідае далонню крошкі са стала, а мужчына накіроўваецца рабіць заказ. Я села за столік каля выхаду, таму што месцаў больш не было. Назіраю, як кур'ер без маскі і пальчатак забірае заказ і стомленай хадой накіроўваецца да выхаду. Здаецца, што ў дзевяць вечара работнікам гэтага кафэ проста не да бяспекі наведвальнікаў, як, зрэшты, і самім наведвальнікам. За сорак хвілін, што я там знаходзілася, так ніхто і не выйшаў працерці мой столік, ні адзін наведвальнік так і не падышоў да дазатара з антысептыкам, ніхто не вытрымліваў дыстанцыю ў паўтара метра, хаця супрацоўнікі і наляпілі пазнакі на падлогу, якія нагадваюць пра гэта...**

Яшчэ сёмага красавіка Мінгарвыканкамам быў зацверджаны план дадатковых мерапрыемстваў па прафілактыцы і зніжэнні распаўсюджвання рэспіраторных інфекцый, у тым ліку выкліканых COVID-19. У плане 25 рэкамендацый для розных арганізацый усіх формаў уласнасці, па сутнасці, яны нагадваюць элементарныя правілы гігіены, якія павінны выконвацца не толькі падчас пандэміі. Так, ёсць сярод іх і парады, якія могуць знізіць колькасць наведвальнікаў, але менавіта цяпер іх проста трэба выконваць. Напрыклад, неабходнасць трымаць дыстанцыю. Хоць кіраўніцтва рэстарана, які я наведала, і прыбрала з залы некаторыя столікі, але з-за вялікай колькасці людзей я не адчула дыстанцыі.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X
20080>